УДК 331.105.44 + 316.3 (476)

# ПРАФСАЮЗЫ Ў СІСТЭМЕ САЦЫЯЛЬНАГА КІРАВАННЯ

Дубовік А.А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

У сацыяльнай сферы і палітычнай сістэме грамадства важная роля належыць прафесійным саюзам – найбольш масавай грамадскай арганізацыі. Як сацыяльны інстытут прафсаюзы маюць сфармуляваныя ў статутах і праграмах мэты дзейнасці; знешнія і ўнутраныя функцыі, накіраваныя на задавальненне патрэб іх членаў і грамадства ў цэлым; сацыяльны статус і ролі; чалавечыя, матэрыяльныя, фінансавыя, інфармацыйныя, тэхналагічныя рэсурсы, дзякуючы якім нормы і прадпісанні, якія ляжаць у аснове іх дзейнасці, могуць паспяхова выконвацца. Галоўная асаблівасць прафсаюзаў у тым, што яны адносяцца да інстытутаў сацыяльнай абароны і рэгулявання сацыяльна-працоўных адносін. Свой уплыў яны аказваюць на арганізацыю, нарміраванне і аплату працы; умовы, ахову працы і яе бяспеку; занятасць; сацыяльнае страхаванне і інш. Абарончую функцыю прафсаюзы ажыццяўляюць шляхам стварэння нарматыўна-прававых асноў узаемаадносін паміж суб'ектамі сацыяльна-працоўных адносін на нацыянальным узроўні і калектыўна-дагаворнай практыкі на ўзроўні прадпрыемства. Прафсаюзы выконваюць і функцыю працоўнай сацыялізацыі [1]. Асаблівае значэнне мае працоўная адаптацыя, гэта значыць уваходжанне ў працоўнае асяроддзе, засваенне прафесіі, норм калектыўнага жыцця і працоўнай маралі, адносін да працы.

Прафсаюзы з'яўляліся важным элементам палітычнай сістэмы савецкага грамадства, выконвалі ролю школы кіравання, гаспадарання і выхавання працоўных, што атрымала замацаванне ў Канстытуцыях СССР і БССР, якія далі прафсаюзам права ўдзельнічаць у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі, у вырашэнні эканамічных, палітычных і сацыяльна-культурных пытанняў. Яны былі надзелены правам заканадаўчай ініцыятывы, удзельнічалі ў планаванні развіцця народнай гаспадаркі, ажыццяўлялі кантроль за выкананнем заканадаўства аб працы і правілаў па ахове працы, за жыллёва-бытавым абслугоўваннем рабочых і служачых, кіравалі дзяржаўным сацыяльным страхаваннем, санаторна-курортнымі, культурна-асветніцкімі, турыстычнымі і спартыўнымі ўстановамі, якія знаходзіліся ў іх падпарадкаванні. Формай удзелу прафсаюзных органаў у дзяржаўным будаўніцтве была іх праватворчая дзейнасць. Прафсаюзы і дзяржаўныя органы прымалі сумесныя нарматыўныя акты. Аднак з

распадам СССР прафсаюзы страцілі права заканадаўчай ініцыятывы, кіраванне аховай працы, сацыяльным страхаваннем.

У постсавецкі перыяд найбольш дзейсным сродкам уплыву прафсаюзаў на сацыяльна-эканамічнае развіццё з'яўляюцца механізмы сацыяльнага партнёрства як сістэмы ўзаемадзеяння паміж прафсаюзамі, наймальнікамі і дзяржавай. Прававыя асновы сацыяльнага партнёрства замацаваны ў артыкуле 14 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і ў Працоўным кодэксе. Падмуркам партнёрскіх адносін з'яўляецца сістэма распрацоўкі, заключэння і рэалізацыі калектыўных дагавораў і пагадненняў. Асноўнай формай трыпартызму на нацыянальным узроўні выступае заключэнне Генеральнага пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў. Цяпер дзейнічае падпісанае ў лістападзе 2021 г. Генеральнае пагадненне на 2022–2023 гг. Акрамя таго, заключаюцца рэгіянальныя (абласныя і г. Мінска), рэспубліканскія і абласныя тарыфныя, гарадскія і раённыя мясцовыя пагадненні. Калектыўна-дагаворным рэгуляваннем працоўных адносін ахоплена абсалютная большасць прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый. Органамі сістэмы сацыяльнага партнёрства з'яўляюцца Нацыянальны савет па працоўных і сацыяльных пытаннях (НСПСП), створаны ў 1995 г. на парытэтных асновах, і аналагічныя саветы ў галінах народнай гаспадаркі і рэгёнах [2]. Адным з сустаршыняў НСПСП з'яўляецца Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) М. С. Орда. Цяпер ФПБ аб'ядноўвае 15 узбуйненых галіновых прафсаюзаў (замест 28 ранейшых) і налічвае больш за 4 млн. членаў, або 96,5 % эканамічна актыўнага насельніцтва. Механізмы сацыяльна-працоўнага партнёрства даюць магчымасць вырашаць спрэчныя пытанні за сталом перамоў, шляхам пошуку кампрамісаў і дасягнення ўзаемнай згоды, садзейнічаюць сацыяльна-эканамічнай і палітычнай устойлівасці беларускага грамадства.

Разам з тым трэба ўнесці змяненні і дапаўненні ў заканадаўства па пытаннях рэгулявання калектыўных працоўных адносін, павысіць адказнасць службовых асоб і бакоў за выкананне абавязацельстваў, а таксама працэдурных норм, якія вызначаюць умовы і механізмы ўзаемадзеяння сацыяльных партнёраў. Наспела неабходнасць прыняцця Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сацыяльным дыялогу (партнёрстве)”, які б садзейнічаў станаўленню моцных суб'ектаў сацыяльна-працоўных адносін. Мэтазгодна правядзенне маніторынгу развіцця сацыяльнага партнёрства, што дасць магчымасць аператыўна ўносіць карэктывы ў механізмы яго рэалізацыі, адмаўляцца ад састарэлых і ўводзіць новыя сацыяльныя тэхналогіі партнёрства, якія павышаюць яго эфектыўнасць.

Акрамя сацыяльнай абароны працоўных ФПБ займаецца фарміраваннем адзінай інфармацыйнай прасторы, закліканай накіроўваць

дзеянні членаў прафсаюзаў на рашэнне задач, якія стаяць перад краінай. У гэтым ёй дапамагае газета “Беларускі Час”, радыёстанцыя “Новае радыё”, інтэрнет-рэсурс 1prof.by, які забяспечвае інфармацыйнай падтрымкай эканамічна актыўнае насельніцтва Беларусі па пытаннях рынку працы, змяненняў у заканадаўстве і г. д.

Прафсаюзы ў сваіх статутах і праграмах не фармулююць палітычных мэтаў, але ахоп шырокіх мас насельніцтва дазваляе ім аказваць уплыў на сацыяльна-эканамічную палітыку дзяржавы, а таксама выступаць у якасці актара палітычных працэсаў. З дапамогай розных інструментаў прафсаюзы могуць уплываць на прыняцце палітычных рашэнняў: іх прадстаўнікі ўдзельнічаюць у выбарах у органы дзяржаўнай улады, уваходзяць у грамадска-палітычныя структуры. Адной з форм палітычнага ўдзелу прафсаюзаў з'яўляюцца сустрэчы з прадстаўнікамі ўлады і прыцягненне іх да мерапрыемствы ФПБ. Рэгулярны характар носяць сустрэчы старшыні ФПБ М. С. Орды з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам. Прафсаюзы зацікаўлены ў тым, каб і органы ўлады, і насельніцтва краіны ведалі аб іх пазіцыі ў сацыяльна-працоўнай сферы.

Такім чынам, прафсаюзы займаюць важнае месца ў сістэме сацыяльнага кіравання ў Беларусі. Яны маюць арганізацыйныя, нарматыўна-прававыя, ідэалагічныя, інфармацыйныя і іншыя рэсурсы, якія дазваляюць ім выступаць у якасці ўдзельнікаў сацыяльна-эканамічных і палітычных працэсаў, здольных непасрэдна ўплываць на сацыяльнае развіццё. Удзел ФПБ у жыцці беларускага грамадства можна ахарактарызаваць як партнёрскую мадэль, накіраваную на канструктыўнае супрацоўніцтва з наймальнікамі і органамі дзяржаўнай улады шляхам сацыяльнага дыялогу і пошуку кампрамісаў.

## Літаратура

1. Башмаков, В. И. Профсоюзы как институт регуляции социально-трудовых отношений: автореф. дис. ... д-ра социолог. наук; 22.00.08 - социология управления / В. И. Башмаков; Государственный университет управления. – Москва, 2001. – 54 с.

2. Дубовік, А. А. Стварэнне і дзейнасць інстытуцыйных органаў сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь ў 1990-я гг. / А. А. Дубовік // Сборник научных трудов кафедры «История, мировая и отечественная культура» / Под ред. В. А. Божанова и Д. Н. Хромченко. – Минск: БНТУ, 2014. – Вып. 4. – С. 62–73.